ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 272 (1239) || АЎТОРАК, 25-га лістапада 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . . 30 кап.
3 месяцы . . . . 90 „
6 месяцаў . . . . 1 р. 80 „
1 год . . . . 3 р. 30 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25,
сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

К X ЗЬЕЗДУ ЛКСМБ ДАМО 40.000 ПАДПІШЧЫКАЎ „ЧЫРВОНАЙ ЗЬМЕНЫ“

ЯЧЭЙКІ ЛКСМБ, УПАЎНАВАЖАНЫЯ „ЧЗ“, РАЗГОРТВАЙЦЕ ПАДПІСКУ на газэту „ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА“ НА СЬНЕЖАНЬ І СТУДЗЕНЬ М-ЦЫ

Кантрольныя лічбы набору—выканаць!

...тымі днямі скончыла сваю пра...ярговая ўсасаюзная нарада па ...анізацыі працы. Скліканьне гэ... нарады супадае з падрыхтоў... да 3-га году пяцігодкі,—году, ...кім наша прамысловасьць ня...алымі тэмпамі пойдзе ўперад, у ...ю чаргу патрабуючы далейшых ...саваных тэмпаў будаўніцтва ...рычна-заводзкага вучнёўства.

...арада абгаварыла ход будаўніц... ФЗВ і яшчэ раз пацьвердзіла ...вільнасьць лініі партыі і комса...у ў пытаньні барацьбы супроць ...ыцэўскіх мэтадаў падрыхтоўкі ...раў, за адзіна-правільную сы...му—ФЗВ.

...ачатак 3-га году пяцігодкі су...ае з вялікім студзеньскім набо... у ФЗВ. У гэтым наборы па ...ай беларускай прамысловасьці ...інна быць набрана 5220 чала... Гэта значыць—ахапіць новыя ...чы працоўнай моладзі кузьнямі ...аўдных політэхнічных кадраў і ...таваць кадры для новых гіган... соцыялістычнай вытворчасьці. ...арацьба за ФЗВ, супроць ЦІП'у ... буржуазнай, опортуністычнай ...тэмы, і профшкол, як аджыўшай ...рыгоднай для сучаснасьці сы...ы, павінна разгортвацца зараз ...аблівай вастратою.

...дзел кадраў ВСНГ БССР у пя...ку падрыхтоўкі кадраў імкнуў... ...рапягнуць ЦІП, як галоўную ...эму, і зараз працягвае сваю ...тыку. Замест 5220 чалавек, ...аных разьвёрсткай ВСНГ ...Р, ён мяркуе набраць усяго... ...Нарэшце, да сёньняшняга дня ...ратна ня ведае яшчэ колькі ... набрана.

...мат школ не падрыхтавалася ...а ведае сваіх патрэб у на...

...У барацьбе за кадры, партыя і ...самол могуць пакінуць проф...школу, як часовую форму пад...тоўкі кадраў па некаторых га...х прамысловасьці.

...учы па шляху найменьшага су...ціўленьня, шляху бязумоўна ...ртуністычным, аддзел кадраў ВСНГБ імкнецца рэорганізаваць усе профшколы ў ФЗВ і гэтую рэорганізацыю аднесьці за лік студзеньскага набору.

Такім чынам, пад шыльдай рэорганізацыі профшкол працягваецца тэндэнцыя не змагацца за зьніжэньне цяжкасьцяй і перашкод, а пайсьці па шляху найменшага супраціўленьня—скараціць зімовы набор у ФЗВ.

Ленінскі комсамол пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі змагаецца за ФЗВ. Высунутая проблема кадраў зьяўляецца важнейшай проблемай дня. Усе сілы комсамолу павінны быць мобілізаваны на барацьбу за ФЗВ, на стварэньне спрыяючых умоў для працы іх.

9-ы зьезд УсеЛКСМ зьяўляецца фінішам ўсебеларускай культэстафэты. Адзін з галоўнейшых маршрутаў эстафэты—маршрут за кадры. У сувязі з гэтым, на шляху да X зьезду ЛКСМБ, мы павінны праверыць выкананьне пастаноў партыйных органаў па пытаньню форсаваньня будаўніцтва ФЗВ і барацьбы за 100 проц. выкананьне пляпаў зімовага набору. Адначасова з гэтым неабходна прыкласьці максымум энэргіі для зьнішчэньня ўсіх перашкод, закаранеласьці і галавацяпства, якія сустракаюцца на шляху стварэньня спрыяючых умоў для працы ФЗВ.

X-ы зьезд ЛКСМБ павінен будзе падвесьці вынікі дзейнасьці комсамолу ў яго барацьбе за кадры на працягу ўсіх мінулых год, намеціўшы далейшыя шляхі, па якіх павінен пайсьці комсамол Беларусі для ажыцьцяўленьня дырэктыў партыі ў галіне падрыхтоўкі кадраў.

Ударныя тэмпы соцыялістычнага будаўніцтва патрабуюць ударных тэмпаў падрыхтоўкі кадраў для соцыялістычнай прамысловасьці. Усім опортуністычным вылазкам, недаацэнцы ФЗВ і орыентацыі на опортуністычныя мэтады ў падрыхтоўцы кадраў павінен быць нанесен канчатковы, руйнуючы, бальшавіцкі ўдар.

Грамавыя перакаты рэволюцыйнага абурэньня

Працоўныя масы патрабуюць расстрэлу контррэволюцыянэраў-шкоднікаў

У адзнаку гэроічнай барацьбы АДПУ з контр-рэволюцыяй прапануем пачаць збор сродкаў на пабудову дырыжабля імя АДПУ

Сёньня пачынаецца процэс над контр-рэволюцыянэрамі, шкоднікамі, членамі „Прамысловай партыі“. Выкрыцьцё контр-рэволюцыйнай шкодніцкай організацыі „Прамысловая партыя“, якая ставіла сваёй задачай зьвяржэньне пролетарскай дыктатуры ў Савецкім Саюзе пры дапамозе інтэрвэнцыі, выклікала вялізарную хвалю абурэньня ня толькі сярод шырокіх працоўных мас Савецкага Саюзу, але-ж і рабочае клясы замежных краін. Шматлікія мітынгі, якія адбыліся з поваду раскрыцьця контррэволюцыйнай організацыі, дзе працоўныя аднагалосна патрабуюць жорсткай расправы над контррэволюцыянэрамі, зьяўляецца найлепшай сьведкай гэтага абурэньня.

У адказ на контррэволюцыйную дзейнасьць шкоднікаў працоўныя масы яшчэ больш самамобілізуюцца на выкананьне задач партыі па соцыялістычнаму будаўніцтву.

У адказ на падрыхтоўку ваеннай інтэрвэнцыі працоўныя масы абяцаюць яшчэ больш узмацняць абароназдольнасьць Савецкага Саюзу.

У адзнаку гэроічнай работы АДПУ па змаганьню з контррэволюцыяй мы выносім прапанову аб пабудове дырыжабля імя АДПУ.

Комуністычны і левы друк Нямеччыны аб контррэволюцыйнай „Прамысловай Партыі“

БЭРЛІН, 23. Нямецкая рабочая кляса ўдзяляе вялізарную ўвагу справе выкрытай у СССР контррэволюцыйнай „прамысловай партыі“. Комуністычны і левы друк перадрукаваў вялікія вытрымкі з абвінаваўчага заключэньня. Шэраг газэт друкуюць, акрамя таго, справаздачы сваіх уласных корэспондэнтаў з Масквы. Сёньняшні нумар „Ротэ Фанэ“ аддае цэлую паласу справе контррэволюцыянэраў і інтэрвэнтаў.

У перадавой газэты гаворыцца: —„Выкрыцьцё контррэвалюцыйнага ваеннага загавору і яго сеці, якая раскінулася паміж Масквою і Парыжам, і тайных плянаў францускага генштабу праліваюць яркое сьвятло на становішча ў Эўропе. АДПУ жорсткім ударам адшвырнула ў бок кулісы і выкрыла сапраўдны твар „пан-эўропэйскіх пацыфістых“, двурушнікаў пакту Келёга. Праз некалькі дзён, калі расійскі пролетарыят зробіць разьлік з ворагамі, калі гэтыя банды будуць фізычна зьнішчаны—тады ва ўсім капіталістычным сьвеце пачуецца дзікі вой. Тыя самыя „пацівыя“ рэдактары, якія без хваляваньня і між іншым паведамляюць аб забойствах рэволюцыйных барацьбітоў, аб атручваньні ўдушлівымі газамі індыйскіх вёсак і аб зьнішчэньні тысяч сямействаў працоўных Кітаю,—яны адразу гакажуць у сваіх сэрцах гарачае чалавекалюбіе. Мы-ж гаворым рабочым і сялянам СССР:—„Так ім і трэба. Зьнішчайце ворагаў вашага соцыялістычнага будаўніцтва і нашай агульнай бацькаўшчыны“.

Даёш дырыжабль імя АДПУ

Сёньня пачынаецца працэс групы шкоднікаў, якая імкнулася шляхам шкодніцтва і падрыхтоўкі інтэрвэнцыі пасягнуць на заваёвы Кастрычнікаўскай Рэволюцыі і гэроічнай барацьбы пролетарыяту на працягу 13 год. „Прамысловая Партыя“ ў саюзе і пад кіраўніцтвам Францускага Генэральнага Штабу прабіралася ва ўсе органы нашай народнай гаспадаркі і толькі дзякуючы вернаму вартаўніку дыктатуры пролетарыяту АДПУ, контррэвалюцыйная шкодніцкая організацыя выкрыта і зараз прадстане прад пралетарскім судом.

Рыхтуючы інтэрвэнцыю, прамысловая партыя імкнулася задушыць Савецкі Саюз. У адказ на гэта неабходна яшчэ больш згуртаваць шэрагі рабочай клясы вакол камуністычнай партыі і ўзмацніць абароназдольнасьць нашай краіны.

З гэтай мэтай мы, колектыў супрацоўнікаў рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена“, выдавецтва „Піонэр Беларусі“, „Юнгер Арбэтэр“, „Юнгер Ленінец“ і „Іскры Ільліча“ прапануем пабудаваць дрыжабль імя вернага вартаўніка дыктатуры пролетарыяту АДПУ і ўносім у фонд пабудовы гэтага дрыжаблю—125 рублёў.

З свайго боку мы выклікаем усе рэдакцыі газэт, рабселькораў, усе ўстановы і прадпрыемствы пасьледваць нашаму прыкладу з тым, каб дырыжабль імя АДПУ мог у хуткім часе рэяць над нашай краінай у адказ усім імпэрыялістычным драпежнікам і ўсім тым, хто задумае пасягнуць на нашу краіну.

Пастанова бюро ЦК ЛКСМБ

ад 19-XI—1930 г.

...а інформацыі прадстаўнікоў ЦК ...выніках правядзеньня райкон...эрэнцый 15 XI—30 г. (Рубенчык ...Магілеў, Палякоў—Слуцак, Зай...—Хойнікі, Гуткін—Гомель, гар. ...ельск.).

...аслухаўшы інформацыі тавары..., якія выяжджалі на райконфэ...цыі ЛКСМБ 15-16 лістапада, ...о ЦК ЛКСМБ адзначае, што:

... Праведзеныя конфэрэнцыі ...адчаць аб узрослай політ-ак...ўнасьці мас комсамолу, а больш ...ычных адносінах да пытаньняў, ...я сталі на конфэрэнцыях (спра...здачы камітэтаў). Гэта ўшчэнт ...бівае тэорыю правых опортуні... ...х тыпу Бутыркіна Мінаева, ...ешава і іншых аб тым, што ...ол перажывае крызіс і г. д. Па...ныя разважаньні падтрымлівалі ... некаторых райконфэрэнцыях па...обныя дэлегаты (Хосід—Слуцак) ...учы, што „мы топчамся на ад...м месцы“, чаму райконфэрэнцыі ...і рашучы бальшавіцкі адпор.

2. Ня гледзячы на дадзеныя ЦК ...рэктывы і прынятыя рашэньні ...ходзе райконфэрэнцый ад 5-XI—1930 г., якія патрабавалі ад усіх РК забясьпечыць належную падрыхтоўку да райконфэрэнцый—пасобныя РК гэтага ня выканалі, як Рагачоўскі, дзе конфэрэнцыя сарвалася з-за непадрыхтаванасьці (не зьявіліся дэлегаты 16 ячэек), за што бюро Рагачоўскага РК абвясьціць вымову.

3. Бюро ЦК констатуе, што Гомельская сельская конфэрэнцыя прашла без належнай падрыхтоўкі (з 140 дэлегатаў зьявілася—68). Да таго-ж, былы сэкратар РК—Вусевіч, якога, за 16 дзён да конфэрэнцыі ўзялі на працу ў РК КП(б)Б, катэгорычна адмовіўся зрабіць справаздачу ў РК ЛКСМБ. На вынесеныя прапановы дэлегатаў аб правядзеньні праверкі шэфства ЛКСМБ над усеабучам ён у пісульцы напісаў:—„Лічу, што паджыгаць няма чаго, аб гэтым можна будзе загутарыць там, дзе гэта трэба“.

Бюро ЦК ЛКСМБ разглядае гэта, як заціск крытыкі з боку Вусевіча. РК КП(б)Б, ня гледзячы на запатрабаваньні некаторых дэлегатаў, ніякіх захадаў ня прыняў, а вынес зусім неадпавядаючую пастанову, зьмест якое:—„конфэрэнцыя прашла пры шырока разгорнутай самакрытыцы і адмяніць яе няма ніякай неабходнасьці“. Выходзячы з гэтага, бюро ЦК пастанаўляе:

а) Гомельскую сельскую райконфэрэнцыю адмяніць;

б) Пытаньне аб нерэагаваньні РК КП(б)Б на меўшы месца заціск самакрытыкі на райконфэрэнцыі ЛКСМБ перадаць у ЦК КП(б)Б.

в) Справу аб тав. Вусевічу, які будучы сэкратаром РК, адмовіўся зрабіць справаздачу на райконфэрэнцыі, перадаць за заціск у крытыцы на разгляд у парт. органы.

4. Багушэўскую райконфэрэнцыю, на якой мелася парушэньне ўнутрысаюзнай дэмократыі—галасаваньне сьпісам пры выбарах РК—адмяніць.

5. Пытаньне аб прадстаўніку ЦК, які прысутнічаў на Багушэўскай райконфэрэнцыі, абгаварыць на бюро асобна.

6. Прапанаваць РК, дзе адменены конфэрэнцыі, правесьці іх 29—30 лістапада, забясьпечыўшы адпаведную падрыхтоўку, згодна ранейшых дырэктыў ЦК.

7. Папярэдзіць РК ЛКСМБ, што абраным звыш нормы дэлегатам ня будуць прадстаўлены мандаты на X-ы зьезд і што яны будуць пасланы назад за рахунак РК.

8. Бюро адзначае амаль што адсутнасьць парткіраўніцтва з боку РК КП(б)Б—(Рагачоў, Гомель-сельскі, Багушэўскі), аб чым давесьці да ведама ЦК КП(б)Б.

9. Гэтую пастанову апублікаваць у друку.

Сакратар ЦК ЛКСМБ Палякоў.

Патрабуем расстрэлу контррэвалюцыянэраў

Агульна-гарадзкі сход інжынэрна-тэхнічных работнікаў Менску ў сваёй пастанове па дакладу аб „Прамысловай партыі“ і яе контррэволюцыйнай дзейнасьці гаворыць:

— Сход інжынэрна-тэхнічных работнікаў гор. Менску ганьбіць здраднікаў—удзельнікаў „прамысловай партыі“—партыі ворагаў пролетарыяту, і патрабуе ад органаў пролетарскай дыктатуры вышэйшай меры соцыяльнай абароны да ўсіх удзельнікаў шайкі агэнтаў міжнароднага капіталу. „Вораг, які не здаецца—павінен быць зьнішчан“.

Сход вітае зіркае вока пролетарскай дыктатуры—вартаўнікоў кастрычнікаўскіх заваёў—Дзяржаўнае Політычнае кіраўніцтва і хадайнічае перад ЦВК СССР аб узнагародзе ОДПУ ордэнам Леніна.

Сход заклікае інж. тэх. работнікаў яшчэ шчыльней згуртавацца навакол комуністычнай партыі і яе Цэнтральнага Камітэту, аддаць усе сілы на ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, на ажыцьцяўленьне 5-ці годкі ў чатыры гады, на ўсямернае разгортваньне соц. спаборніцтва і ўдарніцтва.

У ногу з усёй рабочай клясай, пад кіраўніцтвам Ленінскай партыі, наперакор правым ухілістым—агэнтам клясавага ворага, наперакор бяспрынцыпнаму права-„лявацкаму“ блёку двурушнікам—будзем няўхільна ажыцьцяўляць пад кіраўніцтвам партыі задачы соцыялістычнага будаўніцтва.

Вон з нашых шэрагаў здраднікаў, шкоднікаў, вышыкаў, якія сумняваюцца ў тэмпах соцыялістычнага будаўніцтва.

Няхай жыве КП(б)Б!

Няхай жыве правадыр партыі пролетарыяту—тав. Сталін!

Няхай жыве і мацнее зіркі вартаўнік заваёў Кастрычніка—ДПУ!

РАБОЧУЮ „СЬМЯКАЛКУ“ НА СЛУЖБУ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ — РАЦЫЯНАЛІЗАЦЫІ —

Фрунзаўскі РК ЛКСМБ у парадку падрыхтоўкі да зьезду праводзіць вечар рабочай „сьмякалкі“—агляд рацыяналізатарскіх прапаноў рабочых

Ініцыятыву Фрунзаўцаў павінны падхапіць усе КСМ ячэйкі

ЦП саюзаў і фабзаўмясцкомам

Згодна пастановы ФРК ЛКСМБ і ЦСПСБ, 10 сьнежня 1930 г. праводзіцца па Фрунзаўскім раёне вечар рабочай сьмякалкі.

Для пасьпяховай падрыхтоўкі к вечару вам неабходна правесьці наступнае:

1. Масавы паход за збор і рэалізацыю рабочых прапаноў.
2. Абгаварэньне вынаходак і хуткую іх рэалізацыю.
3. Для падагуленьня і далейшага разгортваньня справы рацыяналізацыі вам, сумесна з комсамолам, правесьці вечары збору і рэалізацыі рабочых прапаноў.
4. Вылучэньне брыгад для збору прапаноў па цэхах.
5. Вылучэньне пастоў, якія будуць зьбіраць і рэалізаваць рабочыя прапановы.
6. Вывесіць на чырвоныя дошкі і прэміяваць усіх, хто дае прапановы па палепшаньню вытворчасьці.
7. Ва ўсёй працы па падрыхтоўцы к вечару трымаць цесную сувязь з комсамольскімі організацыямі на мясцох.

Сэктар вытворчасьці ЦСПСБ.

ВЕЧАР „РАБОЧАЙ СЬМЯКАЛКІ“

Для лепшай падрыхтоўкі да Х-га зьезду ЛКСМБ, Фрунзаўскі РК пастанавіў:

З мэтай перадаць вопыт і ўзмацніць рацыяналізацыю па прадпрыемствах і ва ўстановах нашага раёну, прыцягнуўшы да гэтага комсамольскую організацыю, наладзіць вечар „рабочае сьмякалкі“. Гэты вечар мае мэту ўскалыхнуць усю комсамольскую організацыю, каб яна прыняла масавы ўдзел у справе рацыяналізацыі, у зборы і рэалізацыі рабочых прапаноў, у выяўленьні вынаходзтваў і дапамозе ім, у шырокім ахопе комсамольцаў і беспартыйнай моладзі рацыяналізатарскімі групамі на прадпрыемствах.

Нарада эканомпрацаўнікоў, якая адбылася 20-ХІ—30 г., ухваліла рашэньні РК ЛКСМБ і пастанавіла:

1. Для організаванага і пасьпяховага правядзеньня вечару, комсамольскія колектывы і ячэйкі на мясцох павінны зараз-жа прыступіць да яго падрыхтоўкі. У чым павінна заключацца падрыхтоўка?

1. У масавым падыходзе за рабочымі прапановамі шляхам:

а) вылучэньня брыгад для збору прапаноў па цэхах,

б) вылучэньня пастоў для атрыманьня і рэалізацыі рабочых прапаноў,

в) вывешваньня на чырвоную дошку і прэміяваньня ўсіх тых, хто дае прапановы для палепшаньня вытворчасьці,

г) неадкладнай праверкі становішча рэалізацыі рабочых прапаноў на прадпрыемствах і аб'яднаньнях.

2. Штодзённа інформаваць цэхі аб колькасьці і якасьці паданых прапаноў праз спэцыяльна прысьвечаныя гэтаму ільлічоўкі, насьценгазэты і шматтыражкі.

3. Да раённага вечару колектывам і ячэйкам, сумесна з ФЗМК і гаспадарнікамі, правесьці вечары збору і рэалізацыі рабочых прапаноў.

4. Склікаць адкрытыя сходы ячэек сумесна з вытворчымі нарадамі па разбору і прэміяваньню лепшых прапаноў.

5. На вытворчых нарадах заслухаць інформацыю асобных вынаходцаў аб патрэбнай ім дапамозе з боку комсамольскіх, профсаюзных і гаспадарчых організацый.

Гэтыя мерапрыемствы, высунутыя Фрунзаўскім РК ЛКСМ і ўхваленыя ЦСПСБ, павінны знайсьці шырокі водгук сярод рабочых мас фабрык і заводаў.

Профорганізацыі і гаспадарнікі павінны аддаць гэтым мерапрыемствам максымум сілы і ўвагі.

ФРК ЛКСМБ і сэктар вытворчасьці ЦСПСБ.

ПЛЯН

правядзеньня вечару „Рабочае сьмякалкі“ ў Фрунзаўскім раёне

1. Правядзеньне вечару скарыстаць для шырокага разгортваньня справы рацыяналізацыі, наладзіць па ўсім раёне шэфства комсамолу над рабочымі прапановамі.

2. Ва ўсіх ячэйках і колектывах разгарнуць шырокую кампанію па збору і рэалізацыі рабочых прапаноў, падтрыманьня і дапамогі вынаходзтву, прыцягваючы да гэтага профэсыйны і адміністрацыйна-тэхнічны пэрсонал.

3. Вечар правесьці 10-га сьнежня 1930 году з наступным парадкам дня:

1. Рацыяналізацыя, вынаходзтва, збор рабочых прапаноў на фоне выкананьня бальшавіцкіх тэмпаў 3-га году пяцігодкі.

2. Прэміяваньне колектываў, ячэек, асобных рабочых і адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсоналу за лепшыя прапановы.

4. На вечары ўтварыць кантрольныя сталы па аб'яднаньнях: мэталістых, дрэваапрацоўшчыкаў, краўцоў, тэкстыльшчыкаў і г. д., якія будуць прымаць і даваць указаньні па збору і рэалізацыі рабочых прапаноў.

5. Ячэйкам і колектывам штодзённа інформаваць цэхі аб колькасьці і якасьці сабраных прапаноў.

6. Да 8 га сьнежня ўсе колектывы і ячэйкі на аснове сабраных матар'ялаў праводзяць вечары збору і рэалізацыі рабочых прапаноў.

7. Усе ячэйкі і колектывы бяруць шэфства над зборам і рэалізацыяй рабочых прапаноў і вынаходзтваў.

8. Усю падрыхтоўку праводзіць пад пунктам гледжаньня падрыхтоўкі да Х-га зьезду комсамолу Беларусі, увязваючы яе з праводзімымі мерапрыемствамі па прапрацоўцы сустрэчнага прамфінпляну, праверцы колумоў, мобілізацыі энэргіі і ініцыятывы комсамольскіх і рабочых мас на бальшавіцкую падрыхтоўку і выкананьне пляну 3-га году пяцігодкі.

Дні баявой падрыхтоўкі да 10-га зьезду запоўніць практычнай работай

У адказ на выклік Полаччыны

Сустрэчны плян полацкага РК КСМ поўнасьцю быў прыняты на агульным сходзе аршанскай гарадзкой організацыі ЛКСМБ. Аршанскі РК у сваю чаргу намеціў шэраг конкрэтных мерапрыемстваў у справе падрыхтоўкі да зьезду. Сёньня мы ўжо можам рапартаваць аб некаторых вузорных прыкладах з практычнай работы організацыі.

Чыгуначны колектыў ст. Ворша ўзяў на сябе абавязак ліквідаваць ганебныя прарывы на аршанскім вузьле. Чыгуначная комсамольская організацыя сапраўды павярнулася тварам да вытворчасьці, упарта зьнішчаючы прарывы. Комсамольскія ўдарныя брыгады бяруць усесаюзны рэкорд. Комсамолец ударнік Юшкевіч з сваёй ударнай брыгадай дабіліся таго, што паравозы выходзяць з рамонту па абточцы ў 12 гадзін, на што раней траціліся некалькі дзён. Чыгуначны колектыў сваімі брыгадамі значна штурхнуў справу рацыяналізацыі на вытворчасьці. Цяпер на паравозах сэрыі „Щ“ комсамольцы паравозных ударных брыгад езьдзяць удваёх, кандукторскія комсамольскія брыгады, замест 5—6 чал., езьдзяць у чатырох.

Комсамольскі колектыў Асінбуду ў падарунак 10-му зьезду ЛКСМБ упарта працаваў каб забясьпечыць своечасовы пуск станцыі да 8-га лістапада. Ударная комсамольская брыгада монтажы ўстанавіла турбіны ў 8 дзён, а замежны монтэр думаў устанавіць іх за месяц.

Комсамольцы мэханічных майстэрняў гор. Воршы дабіліся выкананьня прамфінпляну на 106 проц. Выстаўленыя заданьні ЦК ЛКСМБ аб адгрузцы 5-ці эшалёнаў бульбы маскоўскаму пролетарыяту выкананы намі на 145 проц. Замест 150 вагонаў скразнымі комсамольскімі брыгадамі адпраўлены 4 эшалёны з 215 вагонаў.

У падарунак 10-му зьезду намі датэрмінова выпушчана 25 комсамольцаў настаўнікаў на фронт ліквідацыі прарываў ва ўсеагульным навучаньні ў раёне Полаччыны. 6 комсамольцаў, з сярэдняй асьветай мобілізаваны і адпраўлены ў Аршанскі раён. У зьвязку з культэстафэтай мобілізавана 212 комсамольцаў на ліквідацыю няпісьменнасьці. На кожным прадпрыемстве будуць організаваны ячэйкі т. ПН.

Яч. „Ленінскі Шлях“ організавала новы колгас з 83 гаспадарак. Тарвіцкая ячэйка ЛКСМБ організавала новы колгас з 23 гаспадарак. Комсамол вёскі організаваў у дзень 7-га лістапада новых 12 чырвоных абозаў. 8-га лістапада наладзілі суботнік на чыгунцы і ў горадзе на карысьць усеабучу. Мы бярэм на сябе абавязак да 10-га зьезду колектывізаваць на 100 проц. комсамольскую організацыю, організаваць правільнае разьмеркаваньне ўраджаю ў кожным колгасе, аднавіць работу з батрацтвам, перабудаваць кожную ячэйку па-новаму і ліквідаваць поўнасьцю прарывы на вузьле.

Мы просім даць мандат з дарадчым голасам ударніку чыгункі Юшкевічу, які сапраўды дабіўся ўзорнай работы.

В. ЛАПІЦКІ.

Імя Х зьезду

Аднойчы нашы курсанты сабраліся ў гурток і дзяліліся ўражаньнямі аб тым, дзе былі і што бачылі. Раптам раздаўся голас курсанта:—„Хлопцы, ведаеце што? Калі я быў у Ленінградзе мне надзвычайна спадабалася жыцьцё комунараў фабрыкі „Скараход“. Чаму-б нам не організаваць такую комуну?!

Група комсамольцаў курсаў піонэр-працаўнікоў задумала організаваць бытавую комуну. Абгаварылі на бюро ячэйкі, комуна організавалася...

Зараз мы адчуваем сапраўды колектыўнае жыцьцё. У комуну ўступіла з 40 чал. курсантаў—32 чал. Комуна носіць імя Х зьезду ЛКСМБ.

Комунар бытавой комуны **І. Майзэль.**

Менск.

НЯ ЗДАЦЬ ЗАВАЯВАНЫЯ ПОЗЫЦЫ

Школа ФЗВ—адзінаверная форма падрыхтоўкі ма... раў для соцыялістычнай прамысловасьці. Пляны з... мовага набору выканаць поўнасьцю.

Рашуча біць па опартуністычным імкненьням ск... раціць набор у ФЗВ, сарваць падрыхтоўку кадр...

Галавацяпы зьбіваюць ФЗВ з позыцы...

Пры Бабруйскім комбінаце ўжо другі год існуе школа імя XVI МЮД'у, якая рыхтуе кваліфікаваных рабочых.

Тэорэтычную і практычную програму навучаньня за 1929-30 год школа выканала цалкам. Сёлета школа знаходзіцца ў катастрафічным становішчы.

Ужо канчаецца 3-ці месяц, як правялі новы набор у школу 75 чалавек, і яшчэ да гэтага часу не наладзілі нормальных заняткаў. Програма амаль не даведзена да вучняў.

Выкладчыкі спэцпрадметаў зрываюць лекцыі. Праца на вытворчасьці праходзіць слаба, бо няма майстэрняў і інструктароў.

Ячэйка ЛКСМБ своечасова ставіла пытаньне аб тым, каб прысьпешыць будаўніцтва майстэрняў, але яны ўсё яшчэ ня скончаны.

Экономічна-бытавое становішча вучняў ФЗВ вельмі кепскае. Вучняў высялілі з інтэрнату і зьмясьцілі ў бараках. Адміністрацыя абяцала даць два стандартныя дамы пад інтэрнаты. Адзін з іх ужо пабудаваны. Але кватэры пазаймалі рабочыя, а фаб... ізноў няма месца. 60 вучняў ... ліся ў бараках.

Бытавая комуна пры ФЗВ ра... даецца, бо завком комбінату і ЦП ... ідуць насустрач. Наогул, ніхто ... паклапоціцца аб тым, каб палеп... грамадзкае харчаваньне і эконом... бытавое становішча вучнёўства. ... гэта выклікае дрэнны настрой у ... няў.

Комсамольская ячэйка неадна... ставіла перад комсамольскімі і ... тыйнымі організацыямі, завкома... міністрацыяй комбінату і нават ... ЦП Саюзу Лесбелу пытаньне ... лепшаньні становішча ФЗВ і лік... цыі прарываў, але ўсе гэтыя ор... зацыі і дагэтуль нічога не зраб... гэтым напрамку.

Набліжаецца студзеньскі набо... школу, але ніхто да яго ня рых... ца. Неабходна ўдарыць па гала... пах, якія не жадаюць выконваць ... рэктывы партыі аб падрыхтоўцы ... раў.

С. РУДНІ...

„Мірныя“ пасяджэньні без хваляваньняў



А ўсё-ж такі трэба, каб гэты пытальнік шмат каго патурбова...

Не дапусьціць скарочаньня зімовага набору ў Ф... за лік рэорганізацыі профшкол

— „Па нашай думцы профшкола агнятрывалага будаўніцтва павінна быць рэорганізавана, бо ніякай глебы для яе далейшага існаваньня і росту няма“,—пішуць нам кіраўнікі грамадзкіх організацый Петрыкаўскай профтэхшколы агнятрывалага будаўніцтва.

У сваім лісьце ў рэдакцыю таварышы расказваюць аб муках, у якіх нарадзілася і жыве гэтая школа.

32 вучні, загадчык і... больш нічога. Адсутнасьць памяшканьня, выкладчыкаў, адарванасьць ад жыцьця—вось твар гэтай профтэхшколы з пачатку яе існаваньня і па сёньня.

„... правучыўшыся 4 месяцы пры самых прымітыўных мэтадах выкладаньня вучні былі накіраваны ў колгасы на практыку. Аднак і гэтай пасылкі на практыку дабіліся з вялікай цяжкасьцю“.

Можна лёгка ўявіць якіх практычных вынікаў дасягнулі ў такой практыцы тэорэтычна не падкаваныя вучні.

Жыцьцё гэтай профтэхшколы—не выключэньне. Такі лёс большасьці профтэхшкол.

— „У малавядомай профшколе ткацтва, якая знаходзіцца каля ст. Старое, вучаць ручному ткацтву на простых драўляных саматужных варштатах. Лекцыі прапрацоўваюць у пустую“—піша нам юнкор Асака. Вучні заяўляюць: „Я-б мог у сваёй цётки лепш навучыцца ткаць, чым тут“.

За невялікім выключэньнем усе профтэхшкольцы хвараюць тэхнічнай няпісьменнасьцю.

Дрэнны склад інструктароў, калечыць вучняў. І гэта характэрна для профтэхшкол.

Яшчэ сьвежы ў памяці газэтныя матар'ялы аб аб'яднанай профтэхшколе ў Менску. Ня лепш стаіць справа і ў профшколе краўцоў, будаўнікоў-дзесятнікаў і інш.

Саматужная падрыхтоўка рабочых кадраў для соцыялістычнай вытворчасьці ёсьць шкодніцтва самага горшага выгляду.

„Школа зусім не мэханізавана, праца праходзіць саматужным спосабам. Няма ведама каго яна рыхтуе, толькі не кваліфікаваных рабочых, бо саматужнікі ня будуць мець уяўленьня аб машынным спосабе апрацоўкі дрэва і ня будуць годны для дзяржаўных прадпрыемстваў“—піша юнкор Прахожы.

Адрыў профтэхшкол ад вы... часьці, замыканьне ва ўласнай ... рупіне, у сваіх майстэрнях яшчэ ... падкрэсьліваюць неабходнась... організацыі профтэхшкол

Калі сюды дадаць яшчэ дрэ... пастаноўку політычнага выхав... вучняў, дык пытаньне аб тым, ... рабочага рыхтуе профтэхшкола ... ясным:

—Дзе выхад? — пытаюць та... шы з Петрыкаўскай профтэхшк...

Соцыялістычным прадпрые... патрэбны людзі з усебакова р... мі здольнасьцямі, якія-б умелі ... тавацца ва ўсёй сыстэме вытвор...

Рыхтаваць такіх рабочых са... ным спосабам з інструктарамі ... Яніцкага—злачынства.

Ас оўнай, агульнапрызнанай ... май падрыхтоўкі кваліфікаваны... раў для соцыялістычнай пра... васьці зьяўляецца ФЗВ.

Рэорганізаваць профтэхшко... ФЗВ, злучыць іх з вытвор... зрабіць жыцьцёвымі стварыць ... для вучобы, мобілізаваць ўвагу ... падарчых, профэсыйных і саве... ганізацый—вось адзіны выхад, ... знаны самым жыцьцём, для ... тоўкі сапраўдных кваліфікава... раў для нашай прамысловасьці.

Ужо зараз гаспадарчыя орга... імкнуцца рэорганізацыю проф... лы ў ФЗВ правесьці за лік ка... нага будаўніцтва і адчыненьня ... ФЗВ.

Гэта права-опортуністычная ... ноўка, імкненьне фактычна ск... набор у ФЗВ павінна атрымаць ... чы адпор з боку ўсёй гра... і ў першую чаргу комсамолу.

Недапусьціць скарачэньня набо... ФЗВ, з бальшавіцкай заўзятасьцю ... гацца за рэалізацыю пастановы ... партзьезду, што „...існуючая ... контыгенты школ ФЗВ ... школ ... вых профэсій павінны быць ... пашыраны“ і рашуча ... зрыць ... опортуністычных імкненьнях скар... зьбіць ФЗВ з заваяваных пазы...

Х-ы зьезд ЛКСМБ павінен ... сказаць сваё слова ў адносінах ... шых шляхоў комсамолу ў гал... рыхтоўкі кадраў і барацьбы ... рымі, аджыўшымі формамі.

КАГАНСК...

Да X-га зьезду праверым выкананьне рашэньняў ЦК УсеЛКСМ

Стаць асноўным дапаможнікам партыі ў рабоце з беднатой і батрацтвам

З трыбуны прадзьездаўскай

Сураская, Горацкая і Клімаўская організацыі ня выканалі пастановы ЦК КП(б)Б і ЦК УсеЛКСМ аб рабоце ЛКСМБ з батрацтвам і беднатой

„Аднэй з галоўнейшых задач ЛКСМБ на вёсцы ёсьць рашучы зрух у справе ўзмацненьня работы сярод мас батрацкай і бядняцкай моладзі, праводзячы сярод іх спэцыяльную работу і гэтым дапамагаючы партыі замацаваць саюз з серадняцкім сялянствам для рашучага наступленьня на кулака“. (З паст. ЦК УсеЛКСМ).

„Адзначаючы зусім нездавальняючы ўдзел комсамолу ў працы па організацыі беднаты і батрацтва, прапанаваць ЦК ЛКСМБ рашуча перабудаваць работу комсамольскіх організацый на вёсцы з тым, каб стаць асноўным дапаможнікам партыі ў справе організацыі беднаты і батрацтва“. (З пастановы ЦК КП(б)Б).

РАШУЧА ЗМАГАЦЦА З ПРАВА-ОПОРТУНІСТЫЧНАЙ НЕДААЦЭНКАЙ РАБОТЫ З БАТРАЦТВАМ І БЕДНАТОЙ

Работа з беднатой і батрацтвам слабое зьвяно комсамольскай работы

Велізарныя посьпехі, якія мы маем у справе колектывізацыі, забясьпечылі поўную магчымасьць партыі замяніць кулацкі хлеб колгасным і ў раёне суцэльнай колектывізацыі перайсьці ад ранейшай політыкі абмежаваньня і выцясьненьня капіталістычных элемэнтаў вёскі да новай політыкі—політыкі ліквідацыі кулацтва як клясы на базе суцэльнай колектывізацыі.

„У адпаведнасьці з усім гэтым, па-новаму ставіцца цяпер пытаньне аб апоры савецкай улады на вёсцы. Цяпер у важнейшых збожжавых раёнах СССР вёска надзяляецца на дзьве асноўныя часткі: на колгасьнікаў, якія зьяўляюцца праўднай і трывалай апорай савецкай улады і на неколгасьнікаў беднаты і серадпякоў, якія пакуль яшчэ не жадаюць увайсьці ў колгасы, але якіх масавая практыка колгасаў, бязумоўна, перакапае адносна найкарацейшы тэрмін у неабходнасьці ўступіць на шлях колектывізацыі“. (З пастановы 16 зьезду).

Партыя не адзін раз адзначала, што пасьпяховае выкананьне задач колектывізацыі і на аснове яе ліквідацыя кулацтва як клясы немагчыма без мобілізацыі батрацка-бядняцкіх мас, без умацаваньня батрацка-серадняцкага блёку і правядзеньня работы па політычнай організацыі беднаты і батрацтва.

ЦК КП(б)Б, у студзені месяцы г. г., у сваёй пастанове аб мерапрыемстве па ўзмацненьню работы па організацыі батрацтва і беднаты і організацыі груп беднаты ў колгасах констатаваў „зусім нездавальняючы ўдзел комсамолу ў працы па організацыі беднаты і батрацтва,—прапанаваць ЦК ЛКСМБ рашуча перабудаваць работу комсамольскіх організацый на вёсцы з тым, каб стаць асноўным дапаможнікам партыі ў справе організацыі беднаты і батрацтва“.

Зьмяшчаемы намі матар'ял аб рабоце КСМ з беднатой і батрацтвам, у парадку прадзьездаўскай праверкі выкананьня рашэньняў ЦК КП(б)Б і ЦК УсеЛКСМ па агляду работы ЛКСМБ, дае поўнае права заявіць, што комсамольскія організацыі (Сураская, Горацкая і Клімавіцкая) гэтага рашэньня ня выканалі. Гэтыя організацыі не скарысталі ўсіх магчымасьцяй у працы па організацыі батрацка-бядняцкай моладзі і дарослых—гэтых соцыяльных праслоек вёскі—на выкананьне чарговых гаспадарча-політычных задач партыі на вёсцы.

Шырока разгортваючы масавую праверку выкананьня рашэньняў ЦК УсеЛКСМ па ўсіх пытаньнях комсамольскай работы абменьваючыся лепшымі ўзорамі вопыту работы, комсамольскія організацыі пад кіраўніцтвам мясцовых партарганізацый павінны асаблівую ўвагу зьвярнуць на разгортваньне і ўзмацненьне работы з батрацка-бядняцкай моладзьдзю, праводзячы сходы і конфэрэнцыі батрацка-бядняцкай моладзі, організуючы яе пад кіраўніцтвам ячэйкі для ўдзелу ў гаспадарча-політычным будаўніцтве вёскі і разгортваньні колектывізацыі. Рашуча ажыцьцяўляць палітыку ліквідацыя кулацтва, клясы, на базе суцэльнай колектывізацыі.

Адасобіліся ад батрацкай і бядняцкай моладзі

Ва Ўладзімірскім сельсавеце, Клічаўскага раёну, батрацтва і бедната выпала з поля дзейнасьці партыйнай і комсамольскай ячэек. Організаваная калісьці група беднаты існуе на паперы.

Пастановы партыйных зьездаў на сходах беднаты і батрацтва не растлумачваліся. Партыйная і комсамольская ячэйкі, пытаньні колектывізацыі ніколі ня ставілі на сходах беднаты. Не зварочваецца ўвагі і на замацаваньне справядлівых адносін паміж беднатой і колгасамі.

Комсамольская ячэйка ніводнага сходу не праводзіла з удзелам колгаснай і батрацка-бядняцкай моладзі. Ячэйка адасоблена ад беспартыйнай батрацка-бядняцкай моладзі. За ўвесь 1930 год у комсамол уцягнута толькі два батракі.

Стальны.

Ігнорують работу з беднатой

Тры комсамольскія ячэйкі Зьвянчацкага сельсавету, Клімавіцкага раёну, не праводзяць ніякай работы па ўцягненьню батракоў у шэрагі ЛКСМБ. Упаўнаважаны Зьвянчацкай ячэйкі ЛКСМ бязьдзейнічае. За ўвесь год ні адзін батрак у гэтую ячэйку ня ўступіў. Ня лепш справа ў Іванаўскай і Росмадораўскай ячэйках.

Гэтыя ячэйкі не абгаварвалі гаспадарча-політычных пытаньняў на сходах батрацка-бядняцкай моладзі. Некаторыя батракі і бядпякі, падпаўшы пад кулацкі ўплыў, выступаюць на сходах супроць тых мерапрыемстваў, якія праводзяцца партыяй і савецкай уладай на вёсцы.

Пост „Чыр. Зьм.“ Пяк.

„Іван ківае на Пятра“...

Ячэйка ЛКСМБ Ральскага сельсавету, Любаньскага раёну, не праводзіць ніякай працы з батрацка-бядняцкай праслойкаю вёскі. Рашэньні XVI зьезду ЎсеКП(б) і XIII зьезду КП(б)Б не прапрацоўваліся на сходах беднаты. Ячэйка ўзвальвае гэтую работу на сельсавет, а сельсавет на комсамольскую ячэйку.

Важнейшыя гаспадарча-політычныя кампаніі праходзяць без актыўнага ўдзелу беднаты.

Права-опортуністычная недаацэнка работы з батрацтвам і беднатой дала сябе адчуць на галоўным вучастку работы на вёсцы—організацыі новых колгасаў і прыліву. За ўвесь час на сельсавеце не організавана ні аднаго новага колгасу, а ў старыя колгасы няма прыліву.

Любаньскі РК ЛКСМБ павінен рашуча ўдарыць па права-опортуністычнай практыцы комсамольскай ячэйкі.

Баброўскі.

Работа з беднатой—важнейшая задача ЛКСМБ на вёсцы

Работа сярод батрацка-бядняцкага насельніцтва вёскі патрабуе шмат увагі ад партыйных і комсамольскіх організацый. Для пасьпяховага вырашэньня задач суцэльнай колектывізацыі і. на яе базе, ліквідацыі кулацтва як клясы—патрэбуецца організаваць батрацка-бядняцкія масы, колгасьнікаў і серадпякоў аднаасобнікаў.

Аднак, у многіх раёнах Беларусі комсамольскія організацыі недаацэньваюць работы сярод бядняцка-батрацкага насельніцтва. Аб гэтым гаворань наступныя факты.

Па шэрагу раёнаў РК СТУ зусім слаба працуе сярод батрацтва і беднаты. Адсутнічае практычная дапамога комсамольскіх організацый у працы камітэтаў СТУ.

Пры абсьледваньні працы Аршанскага РК СТУ выявілася, што ён ня кіраваў сельскімі камітэтамі. Сельскія камітэты сярод беднаты і батрацтва не праводзілі працы, не організоўвалі беднату і батрацтва на выкананьне чарговых гаспадарча політычных мерапрыемстваў партыі і ўраду на вёсцы. Толькі пры 9 сельскіх камітэтах існуюць групы беднаты, але яны не праводзяць працы сярод батрацкага і бядняцкага насельніцтва. Сельскія камітэты ў колектывізацыі вёскі ўдзельнічаюць зусім слаба.

Партыйныя і комсамольскія ячэйкі недаацэньваюць працы сельскіх камітаў і груп беднаты, ня кіруюць ёю.

У Петр.каўскім раёне пры многіх сельскіх камітэтах не організаваны групы беднаты, а організаваныя амаль не працуюць. Комсамольская організацыя у працы сельскіх камітэтаў і груп беднаты прымае слабы ўдзел.

Пры абсьледваньні Тураўскага раённага камітэту СТУ выясьнілася, што сельскія камітэты зусім не ўдзельнічаюць у колгасным будаўніцтве і організацыі прасьцейшых відаў сельска-гаспадарчых аб'яднаньняў. Пры большасьці сельскіх камітэтаў груп беднаты зусім ня існуе.

Абсьледваньне шэрагу раёнаў Беларусі паказвае па слабы ўдзел комсамольскіх організацый у працы груп беднаты. Комсамольцы, якія вылучаны на працу ў сельскія камітэты СТУ, дэзэртуюць з гэтай работы.

Комсамол павінен дабіцца рашучага пералому ў рабоце сярод батрацтва і беднаты. Неабходна выканаць рашэньні ЦК УсеЛКСМБ па гэтаму пытаньню. Работа сярод беднаты і батрацтва ёсьць вялікая політычная работа комсамолу на вёсцы.

ЛОСЬ А.

Ня выканалі рашэньня ЦК УсеЛКСМ аб працы з беднатой

Праз тры тыдні пачне сваю працу дзесяты зьезд комсамолу Беларусі. Зьезд павінен будзе падвесьці вынікі дзейнасьці комсамольскіх організацый на ўсіх франтох соцыялістычнага будаўніцтва, праверыць наколькі ЛКСМБ выканаў рашэньні ЦК КП(б)Б і ЦК УсеЛКСМ па выніках агляду, з боку ЦК УсеЛКСМ працы і становішча комсамольскай організацыі.

Таму зараз, напярэдадні зьезду, неабходна праз друк разгарнуць шырокую масавую праверку працы комсамольскіх організацый з мэтай абмену вопытам лепшых узораў работы і мобілізаваць увагу мас комсамольцаў на барацьбу з слабымі участкамі комсамольскай работы.

ЦК УсеЛКСМ у сваёй пастанове па агляду ЛКСМБ азначыў, што „ў галіне сельскай гаспадаркі дзейнасьць організацыі комсамолу была скіравана галоўным чынам на ўзмацненьне аднаасобных гаспадарак. Комсамол прымаў слабы ўдзел у соцыялістычнай перабудове вёскі на аснове вытворчага коопэраваньня і колектывізацыі... ЦК УсеЛКСМ лічыць, што ЛКСМБ і яго кіруючыя камітэты выразна выявілі прымірэнцтва да фактаў кулацкай політыкі і практыкі (Прышчэпаўшчына)... У большасьці месц не праводзіцца ніякай работы з бядняцкай і батрацкай моладзьдзю“.

Гэтая пастанова ЦК УсеЛКСМ вымагала ад усяго комсамолу Беларусі бязьлітаснага змаганьня з кулацтвам, разгортваньня работы па організацыі бядняцка-батрацкай моладзі, гэтых соцыяльных праслоек вёскі, на барацьбу за колектывізацыю і, на аснове суцэльнай колектывізацыі, ліквідацыю кулацтва як клясы.

Разьвіцьцё цяжкай індустрыі забясьпечыла перамогу колектывізацыі. Важнейшая політычная задача партыйных і комсамольскіх ячэек на вёсцы—організаваць масавы рух за колгасы, забясьпечыць масавы ўдзел бядняцка-серадняцкіх мас аднаасобнікаў у справе соцыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі. Дабіцца-ж гэтага руху мы зможам толькі тады, калі ўвесь комсамол, пад кіраўніцтвам партарганізацыі, па-бальшавіцку возьмецца за разгортваньне працы з беднатой і батрацтвам, калі ячэйкі будуць праводзіць з беднатой не ад выпадку да выпадку, а сыстэматычна, штодзённа будзе праводзіць з імі масавую выхаваўчую працу.

Для ўсіх бясспрэчна, што шэраг комсамольскіх організацый, уразумеўшы ўсю сутнасьць рашэньняў ЦК КП(б)Б і ЦК УсеЛКСМ па агляду комсамолу Беларусі, сапраўды па-бальшавіцку працаваў з беднатой. Прыкладам гэтага могуць быць п а а с о б н ы я ячэйкі Лепельскага раёну (яч. колгасу „Авангард“ і інш.), Жлобінскі р-н (яч. „Расьсьвет Пераможца“ і іншыя), Чэрвеньскі, Слуцкі і цэлы шэраг інш. раёнаў. Комсамольскія ячэйкі гэтых раёнаў сыстэматычна праводзілі працу з батрацка-бядняцкай моладзьдзю, праводзілі з імі сходы, прапрацоўвалі важнейшыя мерапрыемствы партыі на вёсцы. Яны дабіліся актыўнага ўдзелу бядняцка-батрацкіх мас у справе колектывізацыі, хлебазагатовак, у барацьбе з кулацтвам і г. д., а гэтым самым і значнага росту комсамольскай організацыі за лік гэтых соцыяльных праслоек вёскі.

Аднак, ёсьць і такія комсамольскія організацыі, якія, не ўразумеўшы важнасьці рашэньняў ЦК КП(б)Б і рашэньняў ЦК УсеЛКСМ, не мобілізавалі комсамольскія масы на практычнае іх выкананьне. Яны і зараз не праводзяць працы з беднатой і батрацтвам, а калі і робяць што-небудзь, дык гэта толькі выпадкова.

Да тых організацый, якія ня выканалі рашэньняў ЦК КП(б)Б і ЦК УсеЛКСМ трэба аднесьці:

Суражскую комсамольскую організацыю, якая зусім не праводзіла работы з беднатой і батрацтвам, а з-за гэтага ў раёне нездавальняючы прыліў у колгасы, нездавальняючы рост комсамолу за лік батрацка-бядняцкай моладзі. Маецца тэндэнцыя да асераднячваньня росту.

Клімавіцкая організацыя, пасьля праведзенага ў красавіку месяцы зьлёту колгасна-батрацкай і бядняцкай моладзі, таксама ніякай працы з беднатой і батрацтвам не праводзіла. Батрацка-бядняцкая моладзь не мобілізавана на практычны ўдзел у праводзімых гаспадарча-політычных кампаніях (хлеба і бульба загатоўках, вырашэньні проблемы жывёлагадоўлі, сьвінагадоўлі, колектывізацыі). Комсамольскія ячэйкі ня ўдзельнічаюць у працы груп беднаты пры сельсаветах, колгасах і г. д. Паасобныя ячэйкі на працягу году ня прынялі ніводнага батрака і бедняка (Васькаўская, Судзілаўская), а астатнія ячэйкі слаба расьлі.

Вясковыя ячэйкі Горацкага раёну не праводзяць ніякай працы з беднатой і батрацтвам, не організавалі яе на барацьбу з кулацтвам, за разгортваньне колектывізацыі, ячэйкі ня ўдзельнічаюць у працы груп беднаты.

Матораўская ячэйка (Сьмілаўскі р-н) ня лічыць патрэбным для сябе займацца работай з батрацтвам і беднатой, бо думае, што гэту работу павінен праводзіць выключна сельсавет.

Пералічаныя факты з усёй яскравасьцю сьведчаць аб тым, што рашэньні ЦК УсеЛКСМ, у якіх адзначана, што „аднэй з галоўнейшых задач ЛКСМБ на вёсцы ёсьць рашучы зрух у справе ўзмацненьня работы сярод мас батрацкай і бядняцкай моладзі, праводзячы сярод іх спэцыяльную работу і гэтым дапамагаючы партыі замацаваць саюз з серадняцкім сялянствам для рашучага наступленьня на кулака“.— Гэтымі комсамольскімі організацыямі ня выкананы. Яны не мобілізавалі мас комсамольцаў на практычнае ажыцьцяўленьне гэтых рашэньняў і сваёй бязьдзейнасьцю фактычна праяўлялі права-опортуністычную практыку.

К.

ТАМ, ДЗЕ ЗДАЮЦЬ БАЛЬШАВІЦКІЯ ТЭМПЫ

Ганебны прыклад опортунізму на практыцы

Замест баявой мобілізацыі рабочай моладзі на штурм прарыву, на сустрэчу 3-га году пяцігодкі, комсамольскі колектыў фабр... „Дзьвіна" і яго кіраўніцтва растварыліся ў право-опортуністычнай твані, разгільдзяйстве, безадказнасьці, ганебна здалі позыцы...

Нанесьці рашучы ўдар па ныцьцю, разгільдзяйству; мобілізаваць шырокія масы рабочай моладзі, яе творчую ініцыятыву і эн... зыязм на бальшавіцкі штурм прарыву ў выкананьні прамфінпляну; неадкладна ў адпаведнасьці з гэтым, карэнным чынам пера... даваць усю сыстэму саюзнай работы—актуальная неадкладная задача колектыву і гаркому ЛКСМБ

На невялікай адлегласьці ад г. Віцебску раскінулася крывымі курынымі хаткамі Старая Маркаўшчына. За 13 год Кастрычнікавай рэволюцыі Маркаўшчына ўпарта перабудоўваецца ў новую Пролетарскую Слабаду.

У Пролетарскай Слабадзе вырасла вялізарная фабрыка „Дзьвіна".

„На фабрыцы „Дзьвіна" праводзіцца правы ўхіл на практыцы!" Так ахарактарызаваў працу комсамольскага колектыву фабрыкі „Дзьвіна" адзін з дэлегатаў другой гаркомфэрэнцыі Віцебску. Іншыя таварышы, у сваіх выступленьнях таксама падтрымлівалі гэтую думку.

У чым-жа справа? Ці сапраўды гэта так? Хай аб гэтым раскажуць факты.

Опортуністычны дабрабыт

Прыехаўшы цягнікам у Пролетарскую Слабаду і прахлюпаўшы па брудных вуліцах хвілін 15, мы, нарэшце, папалі на вялізную фабрыку „Дзьвіна".

Завкомавец бясконца будзе вам расказваць аб ініцыятыве мас, аб тым, што на фабрыцы шмат ударнікаў, што большасьць рабочых ахоплена соцспаборніцтвам, што нарэшце кіраўніцтва ф-кі добрае. Але, ведаеце, маса... маса не абцёсаная, цёмная, нічога не разумеючая... дробна-буржуазная ідэолёгія. Перашкоды страшэнныя, але, ня гледзячы на гэта, завкомаўцы ўсё-ж працуюць. Вось рэзолюцыі, рашэньні, цыркуляры...

Завкомавец зьбівае вас з панталыку лічбамі, вялікімі і дробненькімі, раскіданымі і сабранымі ўрад. Гэтыя лічбы, рэзолюцыі, рашэньні, цыркуляры вылятаюць з вуснаў, б'юць вас да таго часу пакуль вы, нічога не разумеючы, не пачнеце крычаць:—„Даволі! Даволі!". А калі вы прыдзеце ў сябе, то запытаеце:

— Ды, нарэшце, скажэце, што вамі практычна зроблена?

Тады завкомавец заюліць: „Ды, разумееца... мы шмат чаго зрабілі, але гэтая вясковая з дробна-буржуазнай ідыолёгіяй маса"...

Ён будзе гаварыць шмат і працяжна, але нічога конкрэтнага ня скажа, бо нічога практычнага, эфэктнага ня зроблена. Усё было зроблена, але нічога няма, таму што вельмі шмат „об'ектыўных прычын".

На ф-цы „Дзьвіна"—опортуністычны дабрабыт. Вось уражаньне, якое ахутвае вас пасьля нават вельмі нязначнага азнаямленьня з працай партыйна-комсамольскіх і профэсыйных арганізацый фабрыкі.

Стаўка, якая прымушае біць трывогу

Ідзеш па фабрыцы,—гудуць, трашчаць, сычаць трансьмісіі, круцяцца хутка-хутка. Але, калі вока з гэтых трансьмісій, ды пераскочыць на варштаты, то наткнецца на нявялікія шыльды: „Варштат папсован, сьцеражыся".

— Чаму гэта шмат варштатаў папсавана?

— Ды, ведаеце, кваліфікаванай сілы няма,—адказвае мэханік.

Іду да дырэктара ф-кі.

— Таварыш дырэктар, як стаіць справа з рабочай сілай?

Дырэктар „Дзьвіны" расказвае:

— На фабрыцы працуе 2100 рабочых. З 1-га студзеня мы думаем пусьціць 3-ю зьмену.

— А рабочую сілу дзе вы возьмеце?—пытаюся я, бо добра ведаю дрэннае становішча з кадрамі на „Дзьвіне".

— Мы спадзяемся,—без замяшаньня адказвае дырэктар,—на тое, што ўжо канчаюцца палявыя работы.

Опортуністычная стаўка на самацёк у падрыхтоўцы кадраў, як бачыце, яскрава. І яшчэ горш тое, што надзеі на самацёк разьвіваюцца самым жыцьцём. Кваліфікаваныя сілы фабрыкі таюць. Толькі пасьля водпуску не зьвярнулася на фабрыку 400 чалавек. Сам дырэктар: гэты правадыр стаўкі на самацёк, аб падрыхтоўцы кадраў заяўляе:

— У нас больш рабочых уходзіць, чымся прыходзіць.

900 рабочых патрабуецца для 3-яй зьмены, але на сёньняшні дзень іх няма. Ці патрэбны да гэтага комэнтары?

На фабрыцы небясьпечнае становішча з рабочай сілай, а людзі сядзяць спадзяючыся на самацёк. Вось кончаць на полі дык прыдуць да нас. Такая стаўка прымушае біць трывогу.

Капаюцца, капаюцца ў паперах

Буйнейшая фабрыка БССР „Дзьвіна" мае вялізарнае значэньне для Саюзу, але справа наладжана тут, як самі бачыце, ня зусім добра.

Дырэктар, тав. Ахраменка, расказвае:

—Гадовы плян выканан на 98,9 проц., за кастрычнік месяц недавыканана 22 проц., за 10 дзён лістапада недавыкана 11,24 проц. Вытворчасьць працы надзвычайна нізкая.

Рабочыя дапаўняюць малюнак:

— За апошнія дні прамфінплян на воцерах выканан (самы небясьпечны вучастак працы на фабрыцы Ц. В.) толькі на 13 проц.

Валікі драўляныя нікуды ня варты. Дзерава дрэннае, адрываюцца валокны, а тавар ідзе ў брак.

— Ётрынак для прадзіва не хапае, ды ў большасьці яны без нумароў, што стварае блытаніну.

Процэс зьёмкі з ватэраў займае 15-20 хвілін, раней зьнімалі за 5 хвілін.

Факты крычаць, факты стукаюць у дзьверы заводзкіх організацый, але тыя ня хочуць іх слухаць, адмахваюцца об'ектыўнымі прычынамі („у нас няма сыравіны") і капаюцца, капаюцца ў паперах.

Мабыць, комсамол распусьцілі...

Паўстае пытаньне; што рабілі партыйныя, комсамольскія і профэсыйныя організацыі, добра ведаючы аб гэтых ганебных прарывах? Што зрабілі фабрычныя організацыі калі даведаліся, што з 2100 рабочых фабрыкі занесена ў сьпісы 900 ударнікаў, а на праверцы аказалася 300? Што зрабіла парт. організацыя ф-кі, якая складаецца з 200 чалавек, каб ліквідаваць прарыў фабрыцы? Што зрабіла камсамольская організацыя—110 чалавек, каб за лік 900 чалавек фабрычнай моладзі павялічыць свой рост, мобілізаваць увагу моладзі і ў першую чаргу комсамолу на ліквідацыю прарыву?

Што зрабіў фабком для мобілізацыі ўвагі 2100 рабочых фабрыкі „Дзьвіна" на ліквідацыі прарыву? Што яны зрабілі ўсе разам для барацьбы з правай практыкай на фабрыцы?

Адказ на гэтыя запытаньні, дае адзін рабочы, які працуе на фабрыцы з 1923 г.

Нашы фабрычныя організацыі, асабліва ў апошні час, апынуліся ў палоне бязьдзейнасьці. А аб комсамольскай організацыі я нават і забыўся, бо яна неадчуваецца на фабрыцы. Мабыць, яе распусьцілі...

Гультайства мучыць комсамольцаў

Амаль ва ўсіх цэхах вялізарнай фабрыкі не аказалася ні комсамольскіх ячэек, ні сэкратароў. Пасьля доўгіх пошукаў нам удалася знайсьці адну комсамолку, якая не магла адказаць, хто ў яе ячэйкі сэкратаром. Комсамольцы ня ведаюць ня толькі членаў бюро, але нават сэкратароў ячэек.

Комсамольскі колектыў вось ужо больш месяца без сэкратара, а гарком комсамолу ня турбуецца.

— Гарком партыі не адпускае хлапцоў,—разводзіць рукамі сэкратар гаркамолу тав. Гладуш, — а тым часам комсамольскі колектыў развальваецца, ніхто не нясе нагрузкі, гультайства мучыць комсамольцаў. Некаторыя комсамольцы ня ведаюць адзін аднаго, ня ведаюць аб прыналежнасьці да адзінай організацыі. Некаторыя нават скрываюць сваё комсамольскае званьне каб хутчэй паляцець куды-небудзь дэзэртаваць з больш цяжкога фронту.

На ліквідацыю прарыву „мобілізавалі" партыйцаў і комсамольцаў ня мала іх адмовілася ад гэтай працы.

— Не пайду ліквідаваць прарыў, выключайце!—гаварылі некаторыя.

Усімі забыты колектыў

Ня так даўно ў Віцебску трубілі аб перабудове саюзнай работы. Зараз словы адгучэлі, і што мы бачым?

Да Х усебеларускага зьезду Віцебская організацыя ідзе з вялікім прарывам, да Х зьезду Віцебская організацыя ня выканала рашэньні УІІІ зьезду УсеЛКСМ аб перабудове сыстэмы комсамольскай работы.

На фабрыцы „Дзьвіна" некаторыя комсамольцы—„актывістыя" імкнуцца давесьці: „У нас новая сыстэма сябе не апраўдала(?)"

— Хлопцы ў сэктарах не жадаюць працаваць, ня прымусіш-жа іх (?).

А „мёртвыя душы"—комсамольцы, якія ня лічацца ў картках гаркому актывам, гавораць:

— Раней былі аддзелы, цяпер сэктары, дзе праца ад гэтага не палепшылася. Як і даўней працуюць толькі адзінкі, маса-ж застаецца і надалей „мёртвымі душамі".

На ф-цы „Дзьвіна зусім расхістана сыстэма саюзнай работы, што па сутнасьці прывяло фабрычную комсамольскую організацыю на парог развалу. Гарком комсамолу толькі садзейнічаў яго паглыбленьню.

Сэкратар гаркому комсамолу тав. Гладуш, паціскае плячыма:

— На „Дзьвіне" дрэнна, мы цяпер ведаем гэта. Але мы „забыліся" аб гэтым колектыве.

Усе ведалі, але нічога не рабілі

У фабрычнай комсамольскай організацыі існуюць правыя настроі скаргі на цяжкасьці.

Замест таго, каб весьці працу сярод моладзі, якая прынесла з вёскі дробна-буржуазную ідэолёгію комсамольцы самі румзаюць, ідуць на вудачку клясавых ворагаў.

— Правуй з пустым брухам,—гавораць некаторыя.

— Нічога ў нас няма...

А іншыя проста і нахабна заяўляюць:

— Давайце талён на бацінкі. Я прышоў адтуль, дзе ўжо даўно пачата пяцігодка...

Шаптуны і ворагі скарыстоўвалі гэта. Нашоптвалі, шыпелі:

— Хэ-хе-хе,—жартавалі яны,—хутка на труну талёны прыдзецца браць.

Комсамол не мобілізаваўся супроць гэтых контррэволюцыйных гутарак, а цягнуўся ў хвасьце.

Шмат якія комсамольцы заяўлялі:

— А мне якая справа? Хай гавораць! Што мне больш, чым усім трэба?

Усе чулі гэта, усе ведалі аб гэтым, але ўсе бязьдзейнічалі, усе недаацэньвалі становішча. Ніхто не мобілізаваў фабрычную грамадзкасьць на барацьбу супроць правага і „левага" опортунізму.

Вывады напрашваюцца самі сабой. Яны кароткія:

Раўнаньне на „об'ектыўныя прычыны", адсталыя настроі сярод комсамольцаў, дзяляцтва і капітулянцка-опортуністычнае скланеньне перад цяжкасьцямі, правы ўхіл у практычнай рабоце—такая сутнасьць комсамольскага колектыву „Дзьвіны" і ў першую чаргу яго кіраўніцтва.

Наскрозь гнілая опортуністычная лінія, па сутнасьці не атрымала належнага адпору ад гаркома КСМ.

Гаркому комсамола, які адарваўся ад гэтага колектыву, неадкладна ажывіць кіраўніцтва, навучыць на палітычных уроках „Дзьвіны" ўсю комсамольскую організацыю, мобілізаваць яе для яшчэ больш бязьлітаснай ба... рацьбы з праяўленьнем правага ў... з беспрынцыповым права-„лява... блёкам.

Падняць актыўнасьць мас, уз... някранутыя пласты творчай а... насьці комсамольскіх мас—гэта... жэйшыя задачы Віцебскай гар... комсамольскай організацыі.

Цішка Вер...

Стрэл клясавага ворага

18 лістапада ў вёсцы Зборава кулацкай рукою забіты актыўны комсамолец тав. Бондараў

УЖЫЦЬ ДА ЗАБОЙЦАЎ ВЫШЭЙШУЮ МЕРУ СОЦЫЯЛ... НАЙ АБАРОНЫ

Кулацкім стрэлам з-за вугла, увечары 18 лістапада, пры правядзеньні гаспадарчых кампаній, у в. Зборава забіты актыўны комсамолец тав. Бондараў. У сваім змаганьні супроць шпарка разгортваючагася соцыялістычнага будаўніцтва, кулак ужывае самыя ганебныя, самыя зьверскія мэтады барацьбы—забойства з-за вугла. Забойствам асобных лепшых змагароў фронту клясавай барацьбы, кулак імкнецца працягнуць сваё існаваньне, перашкодзіць і затрымаць нашу напружаную працу па соцыялістычнаму будаўніцтву.

Тав. Бондараў быў забіты ў той момант, калі ён змагаўся за поўнае выкананьне плянаў усіх відаў загатовак, калі ён патрабаваў ад кулакоў выкананьня дадзеных ім... рдых заданьняў.

Экстрэнае пасяджэньне бюро ...гачоўскага райкому ЛКСМБ ... чыла, што забойства тав. Бо... ва ёсьць помста клясавага вор... кулака, і патрабуе ад судовых ... ганаў ужыць да забойцаў вы... шую меру соцыяльнай абароны.

Бюро РК ЛКСМБ заклікае комсамольскую організацыю і рабочую моладзь, у адказ на за... ства тав. Бондарава, яшчэ ... згуртавацца вакол партыі і ... чы ўсе сілы на выкананьне ... фінплянаў, усіх відаў загатовак ... рашучы адпор кулаку, на ... ковую ліквідацыю яго, як ... на базе суцэльнай колект... вацыі.

Паведамленьне

25-га лістапада, а 7 гадзіне ўвечары, у памяшканьні ФРКК-КП(б)Б РСІ адбудзецца пасяджэньне райштабу „ЛК".

З прычыны важнасьці пытаньняў, просьба ўсім зьявіцца своечасова.

Выклікаюцца наступныя т. т.: **Фрыдман, Шчакала, Ліўшыц, Раманоўскі, Грайфэр, Гальпэрын, Сьцянюк, Голуб, Мароз, Касовіч, Мазэль, Галькова, Жалязьняк, Бэрнштэйн, Екельчык і Лейбовіч, Васэрман.** Акрамя названых таварышоў запраша... кіраўнікі атрадаў „лёгкай ... лерыі".

Нач. Райштабу ФРЛК— МІЦЕЛЬМА...

Папраўка

У № 270 „Ч. З." у арт... „Студэнцтва аб ЦРК" па ві... тара ўкралася памылка: замест ... шчыцкага, трэба чытаць Куд...

АДКАЗНЫ РЭДАКТАР— РЭДКОЛ...

Менск, друкарня імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599